

# ВЕЧНЫ АГОНЬ ПЕРАМОГІ

# ВЕЧНЫ АГОНЬ ПЕРАМОГІ



*Нарысы*

Б-359259

Мінск «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА» 2011

БИБЛИОТЕКА
Белорусского государственного
медицинского университета

# ВЕЧНЫ АГОНЬ ПЕРАМОГІ

Кожны новы дзень, пражыты намі, усё далей і далей адводзіць чалавецтва ад той страшнай фашысцкай навалы, якая звалілася на нашу Беларусь падчас Вялікай Айчыннай вайны. Панёсшы вялікія матэрыяльныя, фізічныя, духоўныя і маральныя страты, наш народ, разам з іншымі брацкімі народамі былога Савецкага Саюза, не скарыўся, а зрабіў усё магчымае і немагчымае, каб выгнаць акупантаў з роднай зямлі і ўзняць акрываўлены Сцяг Перамогі. Акрываўлены, таму што несці яго па франтавых дарогах давялося, ахвяруючы жыццём мільёнаў і мільёнаў простых салдат і афіцэраў. Гэты подзвіг не можам забываць ні мы, ні нашы дзеці, ні іхнія нашчадкі. Пра гэта павінен памятаць увесь свет.

Пра герояў той вайны напісана нямала кніг. Але ў памяці франтавікоў, партызан усплываюць усё новыя і новыя старонкі гераізму нашых людзей. У айчынных часопісах «Полымя» і «Нёман» нядаўна прайшла серыя публікацый пра Герояў Савецкага Саюза — ураджэнцаў Беларусі. Нарысы выклікалі зацікаўленасць у чытачоў, у арганізатараў бібліятэчных і школьных мерапрыемстваў, якія прысвячаюцца Дню Перамогі. Таму ў Рэдакцыйна-выдавецкай установе «Літаратура і Мастацтва» было прынята рашэнне аб выданні асобнай кнігі «Вечны агонь Перамогі», у якой вядомыя нашы пісьменнікі, сустрэўшыся (магчыма, з кім і ў апошні ўжо раз) са славутымі ветэранамі, выклалі на паперы іхнія думкі, успаміны, спадзяванні.

Мы шчыра ўдзячныя вам, дарагія ветэраны, за гэтыя сустрэчы. І нізка-нізка кланяемся перад вамі за неверагодны Подзвіг, які вы здзейснілі дзеля нашага шчаслівага жыцця. Хай ваш Агонь Перамогі гарыць вечна!

Мікалай ЧАРГІНЕЦ,
*Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі*

*Мікола Мятліцкі*

## ПЕРАМОГА

Ты ішла франтоў гарачым наступам
З кананадай, гулкаю стральбой.
Столезна сырых магільных насыпаў
Засталося ў свеце за табой.

І цана твая — усім вядомая:
У мільёны выдыхаў салдацкіх,
Хто ляжыць у далечы ад дома
І сягоння у магілах брацкіх.

Ты акопаў кіламетры вырыла
У падзоле глейкім і жвірах
І заўсёды — нежаданым выраем —
Адганяла чалавечы страх.

Сцяўшы зубы, брала ўрукапашную
Пікі безыменныя высот
І хвілінай, гордая, бясстрашная,
Выцірала свой салёны пот.

Ты дымамі шыр зямлі асмужыла
І агнём крышыла і мячом,
Гусеніцай танка поле плужыла.
Чвякала ў дрыгве сырым квачом.

Ля кастроў у слоту часта грэлася
І па сто куляла франтавых.
І, калі атака узгарэлася,
Аддавала ў мёртвыя жывых.

Ты ішла, дзе шпарка, дзе спаволена,
Скрозь прымаючы грудзьмі свінец.
Мроіла ў кароткім сне дазволена,
Што наступіць ёй, вайне, канец.

Свет з руін-пажарышчаў уздымецца,
Выблісне прамень жывой вясны.
І тваім ахвярна-светлым іменем
Назавуць апошні дзень вайны.

## ЗМЕСТ

Вечны агонь Перамогі. *Мікалай Чаргінец* . . . . . . . . . . . . . . . . 3

*Мікола Мятліцкі.* Перамога . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 4

*Анатоль Мікалаеў*
...Зоркаю блісне сляза . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5

*Алесь Марціновіч*
Зорнае неба. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 14

*Пятро Сабіна*
Вясной увенчаны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 32

*Уладзімір Гаўрыловіч*
Вышыня Рыгора Дзенісенкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45

*Анатоль Крэйдзіч*
Лётныя рэкорды . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 60

*Славамір Антановіч*
Кулямётчык Жмуроўскі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 70

*Тамара Кручэнка*
Крутымі вёрстамі вайны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 81

*Анатоль Мяснікоў*
Таварыш камбрыг . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 90

*Віктар Гардзей*
Ад Валдая да Балтыкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 106

*Анатоль Зэкаў*
Доўгія вёрсты вайны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 119

*Мікола Мятліцкі*
Вайны Айчыннай пехацінец . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 128

*Марыя Шамякіна*
Армія вяртае мару . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 138

*Нина Чайка*
Истребитель живет боем,
или «Аллея МиГов» в небе Кореи . . . . . . . . . . . . . 155

*Анна Александрович*
Сказание о доблестном воине . . . . . . . . . . . . . . . . . 173

*Геннадий Ануфриев*
Балтийское небо Федора Фоменкова . . . . . . . . . . 193

*Наум Гальперович*
Минер из Полоцка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 211

*Мая Горецкая*
Знаете, каким он асом был?! . . . . . . . . . . . . . . . . . 216

*Лина Готовская*
Цельность души . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 234

*Леонид Екель*
Звезда Рыбака . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 240

*Людмила Кебич*
Большой судьбы поля и реки . . . . . . . . . . . . . . . . . 250

*Александр Козловский*
По зову сердца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 267

*Виталий Кирпиченко*
Спасатель . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 294

*Альберт Стряпчий*
Звезда со множеством лучей . . . . . . . . . . . . . . . . . 303

*Михаил Шелехов*
Штурмовик . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 326

Б-359259
БИБЛИОТЕКА
Белорусского государственного
медицинского университета